# Памяці вучонага

## ЛЮБОЎ АДАМАЎНА АНТАНЮК



Беларуская навука панесла вялікую і незаменную страту. 6 студзеня 2006 г. пасля цяжкай хваробы пайшла з жыцця доктар філалагічных навук, прафесар Любоў Адамаўна Антанюк.

Л.А. Антанюк нарадзілася 28 красавіка 1949 г. у вёсцы Ломыш Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Ломышскай СШ паступіла ў Мазырскі педагагічны інстытут імя Н.К. Крупскай на аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта, які скончыла з адзнакай у 1970 г. З 1970 па 1973 г. - аспірантка Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа Акадэміі навук; у 1974-1980 гг. - малодшы, а з 1980 па 1991 г. - старшы навуковы супрацоўнік АН БССР. З 1991 г. працавала дацэнтам кафедры сучаснай беларускай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта, а з 1993 г. - прафесарам гэтай жа кафедры. У 1998-2005 гг. - загадчык кафедры беларусазнаўства Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Кола даследчыцкіх інтарэсаў прафесара Л.А. Антанюк было надзвычай шырокім: граматычныя катэгорыі беларускай мовы, тэорыя поля і лексіка-граматычныя палі ў беларускай мове, лексікалогія, культура мовы і маўлення, мова мастацкіх твораў, словаўтварэнне, тэрмінаўтварэнне, станаўленне, развіццё, структура, упарадкаванне, праектаванне і функцыянаванне сучаснай беларускай тэрміналогіі, фармальна-семантычная і камунікатыўная арганізацыя сінтаксічных канструкцый. У 1974 г. Л.А. Антанюк абараніла кандыдацкую дысертацыю «Лексіка-граматычныя катэгорыі сумеснага і ўзаемнага дзеяння ў сучаснай беларускай літаратурнай мове», на аснове якой у 1981 г. апублікавала манаграфію «Станавыя значэнні сумеснасці і ўзаемнасці ў беларускай мове». У 1992 г. паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю «Беларуская тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне», у якой упершыню ў беларускім мовазнаўстве глыбока і паслядоўна вызначыла асноўныя рысы, спосабы і сродкі ўтварэння беларускіх навуковых тэрмінаў як на дыяхронным, так і сінхронным зрэзах мовы, месца тэрміналогіі ў лексічнай сістэме беларускай мовы, фармальна-семантычнае, паняційнае і нарматыўнае упарадкаванне беларускіх тэрмінаў.

Л.А. Антанюк - аўтар звыш 150 навуковых публікацый, у тым ліку многіх манаграфій (Беларуская навуковая тэрміналогія (1987), Сучасная беларуская тэрміналогія (1995), Сінтаксіс беларускай мовы. Словазлучэнне (2003), Сінтаксіс беларускай мовы. Сказ: функцыянальна-семантычны аналіз (2004), Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія (2005) і інш.), слоўнікаў (у сааўтарстве: Русско-белорусский словарь лингвистических терминов (1988), Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў (1990), Музычны слоўнік беларуска-рускі і руска-беларускі (1999)). Яна - адзін з аўтараў акадэмічных выданняў «Беларускай граматыкі» (1986), «Беларуская мова. Энцыклапедыя» (1994), першай фундаментальней працы «Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум»(2003), школьных падручнікаў (Беларуская мова. 8 клас з беларускай мовай навучання (1998, 1999), Беларуская мова. 9 клас (2005)), вучэбных праграм для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей (Сучасная беларуская мова (1998)), многіх артыкулаў і тэзісаў. Падрыхтавала трох кандыдатаў філалагічных навук.

Любоў Адамаўна з'яўлялася членам спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый пры БДУ, выступала афіцыйным апанентам і экспертам дысертацый. Актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці: была вучоным сакратаром Тэрміналагічнай камісіі НАН Беларусі, членам Міжнароднай арганізацыі па уніфікацыі тэрміналагічных неалагізмаў, Міжнароднага банка інтэрнацыянальных тэрміналагічных неалагізмаў, членам аргкамітэтаў многіх навуковых канферэнцый і сімпозіумаў, рэдактарам і рэцэнзентам розных навуковых прац у галіне беларускага мовазнаўства.

Светлая памяць пра Любоў Адамаўну Антанюк, вядомага вучонага, высокакваліфікаванага выкладчыка, клапатлівую маці, сціплага і чулага чалавека, прыгожую і абаяльную жанчыну, назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто яе ведаў.

***З.І. Бадзевіч,***
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы